23 снежня
1997 г.

ПАМЯЦЬ

# Вучань акадэміка Паўлава

У снежні споўнілася 100 год з дня нараджэння вядомага вучонага-медыка, заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара медыцынскіх навук, прафесара Мікалая Уладзіміравіча Вінаградава.

Нарадзіўся ён у 1897 годзе у г.Луга Пецярбургскай губерні у сям'і настаўніка.

З 1948 года ён звязаў свой жыццёвы лёс з нашым горадам, з Віцебскім медыцынскім інсты тутам. Менавіта тут яскрава раскрыўся яго талент — талент вучонага, педагога, роданачальніка беларускай навуковай школы псіхіятрыі, што тлумачыла многія з'явы ў псіхіятрыі з пазіцый нейрафізіялогіі. Звыш 20 год узначальваў прафесар Вінаградаў у ВДМІ кафедру псіхіятрыі. Цяжка злічыць колькасць



студэнтаў, якія пад уплывам лекцый і заняткаў прафесара потым абралі сабе на ўсё жыццё спецыяльнасць псіхіятра. Не адно пакаленне пяцікурснікаў вучылася па яго падручніку, які выдаваўся нават у Японіі. Пад яго кіраўніцтвам абаронен шэраг кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Радзіма адзначыла важкі ўклад М.У.Вінаградава ў развіццё айчыннай псіхіятрыі ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, ганаровым званнем заслужанага дзеяча навукі БССР.

Сёння многае змянілася ў нашым жыцці, у сучаснай медыцыне. Але як заўсёды спяшаюцца пяцікурснікі медыцынскага інстытута ў клініку псіхіятрыі, якую ўзначальвае вучань М.У.Вінаградава доктар медыцынскіх навук, прафесар А.А.Кірпічэнка. А ў інстытуцкім музеі прафесару Вінаградаву прысвечаны спецыяльны стэнд. У яго гонар напярэдадні юбілею была праведзена навукова-практычная канферэнцыя асацыяцыі ўрачоў-псіхіятраў і нарколагаў.

**Л.ЦІТОЎ,**
**дацэнт ВМІ.**